Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# Праграма
# па гісторыі славянскіх народаў

Мінск 1998

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 940 (075.8)
ББК 63.3 (4)я73
П 784

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

Зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета гістарычнага факультэта (пратакол № 10 ад 27 мая 1998 г.)

*Складальнікі:* І.А.Груца, В.Ц.Ісаеў, А.М.Космач, Н.Д.Ляўковіч, У.С.Пуцік, В.М.Фамін, В.Р.Федарасава, У.А.Ціток, Ф.А.Шумскі

*Пад рэдакцыяй* А.П.Жытко, У.В.Тугая, В.М.Фаміна

© Калектыў складальнікаў, 1998

# Тлумачальная запіска

У сувязі з тым, што ў вучэбныя планы гістарычных факультэтаў педагагічных універсітэтаў уведзены курс "Гісторыя славянскіх народаў", выкладчыкамі кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі падрыхтавана адпаведная праграма. Складаецца яна з двух частак: "Гісторыі ўсходніх славян" і "Гісторыі заходніх і паўднёвых славян".

Славянскія народы – гэта своеасаблівы, шматгранны і рознабаковы сацыяльна-гістарычны феномен. Іх гісторыю нельга разглядаць паасобна. У той жа час славянскі свет цесна звязаны з заходнееўрапейскімі ды іншымі цывілізацыямі. Менавіта таму ў праграме прадугледжана асвятленне асноўных этапаў развіцця славянскіх народаў у кантэксце сусветнай гісторыі.

Складальнікі праграмы не прытрымліваліся вузкакласавага падыходу ў тлумачэнні гістарычнага мінулага: у праграме асвятляюцца розныя гістарыяграфічныя падыходы да разгляду ключавых пытанняў гісторыі славянскіх народаў. Пры гэтым яны кіраваліся такімі прынцыпамі гістарычнага пазнання, як аб'ектыўнасць, гістарызм і каштоўнасная значнасць.

Матэрыял праграмы размеркаваны паводле сучаснай перыядызацыі:

*першы перыяд* – сярэднявечча (V – канец XV – пачатак XVI ст.);

*другі* – новы час (XVI ст. – 1917 г.);

*трэці* – навейшы час (1917–1998 гг.).

Перыяды, у сваю чаргу, маюць ключавыя раздзелы.

Праграма прызначана студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Частка I. Гісторыя ўсходніх славян

## Уводзіны

Змест і задачы курса гісторыі славянскіх народаў – арганічная і неад'емная частка сусветнай гісторыі. Метадалагічныя прынцыпы вывучэння гісторыі: фармацыйны, цывілізацыйны і культуралагічны. Праблема перыядызацыі гісторыі ўсходніх, паўднёвых і заходніх славян. Асноўныя тыпы крыніц. Гістарыяграфія вузлавых праблем па гісторыі славянскіх народаў.

## Сярэднявечча (V – канец XV – пачатак XVI ст.)

### *Раздзел 1.* Першыя звесткі пра ўсходніх славян. На шляху да ўтварэння дзяржавы

***Тэма 1. Славяне да сярэдзіны I тыс. н. э.***

Біблейская версія паходжання славян. Сучасныя погляды адносна іх паходжання. Першыя звесткі пра славян (Герадот, Палібій, Тацыт, Страбон). Археалагічныя матэрыялы. Заняткі славян. Родавая абшчына. Вылучэнне ўсходнеславянскіх плямёнаў.

***Тэма 2. Славяне ў VI–VIII стст.***

Візантыйскія крыніцы (Пракоп Кесарыйскі, Маўрыкій Стратэг, Менандр). "Аповесць мінулых гадоў" аб славянах. Развіццё прадукцыйных сіл ва ўсходніх славян у VI–VIII стст. Земляробства, жывёлагадоўля, рамяство, гандаль. Распад родавай і ўзнікненне суседскай абшчыны. "Ваенная дэмакратыя". Палітычныя аб'яднанні. Рэлігійныя вераванні ўсходніх славян.

### *Раздзел 2.* Утварэнне і функцыянаванне дзяржавы ўсходніх славян – Кіеўскай Русі (IX–XII стст.)

***Тэма 1. Утварэнне Кіеўскай дзяржавы***

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы ўтварэння старажытнарускай дзяржавы. "Нарманская тэорыя". Паданне пра Кія. Прызванне варагаў у Ноўгарад. Аскольд і Дзір. Спрэчкі вакол асноўных праблем узнікнення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. Грамадскі і дзяржаўны лад старажытнарускай дзяржавы. Феадальная іерархія.

***Тэма 2. Эканамічнае развіццё Кіеўскай Русі***

Археалагічныя матэрыялы пра заняткі насельніцтва. Земляробства. Сістэмы апрацоўкі глебы, прылады працы. Жывёлагадоўля. Рамяство. Развіццё гарадоў.

Гандаль. Важнейшыя гандлёвыя шляхі. Гандлёвыя зносіны з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, Візантыяй і Усходам.

***Тэма 3. Феадальныя адносіны ў Кіеўскай Русі***

"Руская праўда" – крыніца па вывучэнні феадальных адносін. Катэгорыі феадальнага землеўладання. Залежнасць сялян: "смерды", "закупы", "халопы". Феадальны прыгнёт. Формы сацыяльнага пратэсту. Паўстанні гараджан і смердаў у XI–XII стст.

***Тэма 4. Палітычная гісторыя старажытнарускай дзяржавы***

Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі. Аб'яднанне Верхняй і Ніжняй Русі. Паходы Алега на Візантыю, іх вынікі. Знешняя і ўнутраная палітыка князя Ігара. Рэформы княгіні Вольгі. Барацьба Святаслава з хазарамі і качэўнікамі паўднёвых стэпаў. Узаемаадносіны з Візантыяй. Ацэнка знешнепалітычнай дзейнасці Святаслава ў сучаснай гістарыяграфіі. Міжусобная барацьба паміж Яраполкам і Уладзімірам. Рагвалод. Рэформы Уладзіміра. Барацьба Святаполка і Яраслава за велікакняжацкую ўладу. Княжэнне Яраслава Мудрага. Узвышэнне міжнароднага аўтарытэту старажытнарускай дзяржавы.

***Тэма 5. Барацьба за кіеўскі прастол у XI ст.***

"Лесвічнае ўзыходжанне". Своеасаблівасць родаправавых адносін паміж князямі. Прычыны княжацкіх міжусобіц. Барацьба за велікакняжацкую ўладу паміж сынамі Яраслава Мудрага. Праўленне Уладзіміра Манамаха і яго ацэнка ў гістарыяграфіі.

***Тэма 6. Культура Кіеўскай Русі***

Матэрыяльная культура. Народныя элементы культуры. Пісьменнасць і адукацыя. Першыя навуковыя веды: геаграфія, матэматыка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ